


**8С(Бел)**
**К92**

**Купала і Колас, вы нас гадавалі** : дакументы і матэрыялы. У 2 кн. Кн.1.1909-1939 / уклад.: В. Дз. Селяменеў, В. У. Скалабан; рэд. калегія: М. І. Мушынскі (гал. рэд.) [і інш.]. - Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2010. - 319 с.

Зборнік з'яўляецца своеасаблівым працягам прац Г. Кісялёва «Пуцявінамі Янкі Купалы» і «З жыццяпісу Якуба Коласа», дапаўненнем да Поўнага збору твораў Янкі Купалы. Публікуюцца невядомыя і малавядомыя дакументы, у тым ліку аўтографы класікаў. Аснову зборніка складаюць дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Расійскага дзяржаўнага архіва літаратуры і мастацтва, выкарыстаны таксама матэрыялы музеяў песняроў, Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці, Цэнтральнага архіва Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь і інш.

**Разлічана на літаратуразнаўцаў, гісторыкаў, выкладчыкаў ВНУ і школьных настаўнікаў, студэнтаў, архівістаў, работнікаў бібліятэк і музеяў, краязнаўцаў. Выданне будзе цікавае таксама шырокаму колу чытачоў.**




**Т63.3(2Б)**
**М99**

**Мяснікоў, А. Ф. Сто асоб беларускай гісторыі** : гістарычныя партрэты / А. Ф. Мяснікоў. - 2-е выд., дапрац. - Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2009. - 343 с.

У гісторыі кожнай краіны самы адметны і значны след пакідаюць, як вядома, яе вялікія і знакамітыя асобы: уладары, асветнікі, гісторыкі, дойліды, пісменнікі, мастакі, музыкі ды іншыя выбітныя постаці. «Сто асоб беларускай гісторыі» — першая кніга, дзе пад адной вокладкай аўтар сабраў найбольш вядомыя біяграфічныя партрэты вось такіх неардынарных людзей нашай Бацькаўшчыны. На працягу стагоддзяў па-рознаму адносіліся да іх улады і грамадства. Адных славілі, узносілі ў свой час, іншых — ганьбілі, знеслаўлялі, каралі... Але самы правідны суддзя — гэта час, які сення вынес верны прысуд героям кнігі: пра іх маюць права ведаць усе.

**Кнігі адрасуецца шырокаму колу чытачоў.**




**С (Бел)2**
**К60**
**Колас Я. Родныя вобразы**: вершы. [для ст. школ. узросту / уклад. і прадмова В. Бечыка; маст. Ул. Вішнеўскі]. - Мінск: Юнацтва, 1982. – 191 с. 4 л. іл.

Зборнік вершаў народнага паэта Беларусі.




**8С(Бел)2**
**П 93**

**Пшыркоў Ю.С. Летапісец свайго народа:** жыццевы і творчы шлях Якуба Коласа. - Мінск: Навука і тэхніка, 1982. – 367 с., іл.

Гэта кніга выдаецца да стагоддзя з дня нараджэння Якуба Коласа. Творчасць выдатнейшага пісьменніка Беларусі разглядаецца на фоне вялікіх гістарычных падзей нашага стагоддзя, у непасрэднай сувязі з літаратурным працэсам братніх народаў. Больш глыбока аналізуюцца прызнаныя дасягненні нашай нацыянальнай літаратуры: паэмы «Новая зямля», «Сымон-музыка», трылогія «На ростанях».

**Разлічана на настаўнікаў, студэнтаў ВНУ, навуковых супрацоўнікаў, шырокае кола чытачоў.**




**С(Бел)**
**К 60**

**Колас Я. Выбраныя вершы** / [уклад. М. Лужанін]. – Мінск: Маст. літаратура, 1980. – 240 с.,1 партр.

У зборнік увайшлі выбраныя вершы народнага паэта Беларусі Якуба Коласа.




**8С(Бел)**
**Р 17**

**Разам з народам** : Матэрыялы юбіл. Навук. сесій АН БССР, прысвеч. 100-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа / АН БССР; [пад рэд. І.Я. Навуменкі]. — Мінск: Навука і тэхніка,1983. – 149 с., іл.

У зборнік уключаны даклады, прачытаныя ў Акадэміі навук БССР на навуковых сесіях, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа.

**Адрасуецца ўсім, хто цікавіцца гісторыяй беларускай культуры.**




**8С(Бел)**
**Н 34**

**Навуменка І. Я. Якуб Колас**: Духоўны воблік героя. - 2-е выд., дап. і перапрац. – Мінск: Выд-ва БДУ,1981. – 240 с.

Кніга вядомага беларускага празаіка і літаратуразнаўцы Івана Навуменкі ўяўляе сабой дапоўнены варыянт яго манаграфіі «Якуб Колас. Духоўны воблік героя» (1968).

Прасочваюцца ідэйна-мастацкія пошукі народнага паэта, пачынаючы ад першых вершаў і апавяданняў і канчаючы этапнымі для беларускай літаратуры творамі — «Новая зямля», «Сымон Музыка», «На ростанях», «Казкі жыцця».

**Разлічана на літаратуразнаўцаў, выкладчы-каў, студэнтаў. Папулярнасць выкладання дазваляе рэкамендаваць кнігу шырокаму колу чытачоў.**




**8С(Бел)**
**Н34**

**Навуменка І. Якуб Колас**: нарыс жыцця і творчасці. [для сярэд. і ст. школ. узросту]. – Мінск: Нар. асвета,1982. – 208 с., л. іл. – (Нар. пісьменнікі БССР).

У кнізе вядомага беларускага празаіка і літаратуразнаўцы Івана Навуменкі, адрасаванай вучням, разглядаецца творчасць народнага паэта Беларусі Якуба Коласа як дарэвалюцыйнага, так і савецкага часу. Вялікая ўвага ўдзяляецца ідэйнаму зместу, праблематыцы твораў, іх мастацкаму стылю, паэтыцы, асаблівасцям сюжэту, кампазіцыі, мовы, раскрываецца роля вялікага паэта ў станаўленні беларускай літаратуры.




**С(Бел)2**
**К 92**

**Я. Купала. Собрание сочинений в семи томах.** Том 1. Стихи. Переводы (1904-1907). - Минск: Наука и техника,1972. – 535 с.




**С(Бел)2**
**К 92**
**Купала Я. Выйдзі з сэрдцам, як з паходняй!..** : выбранае. [для ст. школ. узросту / уклад. А. Разанава ; прадм. А. Вярцінскага ; маст. А.В. Александровіч]. – Мінск: Юнацтва,1982. – 191 с., 8 л. іл. – ( Паэтычн. б-ка).

Зборнік выбранай паэзіі народнага паэта Беларусі.




**8С(Бел)**
**К-44**
**Пуцявінамі Янкі Купалы**: дакументы і матэрыялы / уклад., уступ артыкул і імян. паказ. Г.В. Кісялёва; рэд. В.В. Барысенка, М.І. Мушынскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – 312 с., іл.

Зборнік уключае дакументы і матэрыялы аб жыцці і дзейнасці народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Яны раскрываюць паходжанне паэта, паказваюць яго ўдзел у грамадскім жыцці, уплыў яго творчасці на рэвалюцыйную свядомасць беларускага народа, яго ўклад у развіццё шматнацыянальнай культуры Савецкай краіны.




**С(Бел)**
**К 92**

**Купала Я. Выбранае**. – Мінск: Маст. літаратура, 1980. – 224 с., 1 партр.

У зборніку адлюстраваны найбольш яркія старонкі лірыкі народнага паэта — Янкі Купалы.




**8С(Бел)2**
**Л 72**

**Лойка А. Як агонь, як вада…**: раман-эсэ пра Янку Купалу. – Мінск: Маст. літаратура, 1984.- 486 с., 8л. іл.

У кожнага народа ёсць паэты, веліч і значэнне якіх узрастае ад пакалення да пакалення. Творчасць Янкі Купалы даўно ўжо прызнаная ў свеце. Але і само жыццё чалавека такога маштабу і такога лёсу, як Янка Купала,— гэта адна з найцікавейшых старонак у жыцці ўсяго народа. Між тым да апошняга часу не было мастацкай біяграфіі народнага паэта. Упершыню такую біяграфію напісаў вядомы паэт, крытык і літаратуразнавец, доктар філалагічных навук А. Лойка. Яго раман-эсэ пашырае нашы ўяўленні пра чалавечую сутнасць і маштаб творчасці Янкі Купалы.




**8С(Бел)**
**Ж 69**

**Жыдовіч І.К. Янка Купала — публіцыст.** - Мінск, Выд-ва БДУ,1972.

Гэта праца — першая манаграфічная спроба даследавання публіцыстычнай спадчыны Янкі Купалы. Аналізуюцца тэматычныя і стылявыя асаблівасці купалаўскай публіцыстыкі, дзейнасць Я. Купалы як публіцыста, яе сувязь з гістарычнымі і літаратурна-культурнымі падзеямі. Раскрываючы воблік Я. Купалы-публіцыста, даследчык імкнецца ў пэўнай меры асвятліць некаторыя праблемныя пытанні дарэвалюцыйнай і савецкай беларускай публіцыстыкі.




**83.3(4Беи)**
**З-11**

**З росных сцяжын** : аўтабіяграфіі пісьменнікаў Беларусі / сост. : М. Мінзер. - Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2009. - 461 с. - на бел. мове.

Творчасць многіх пісьменнікаў канца XX - пачатку XXI ст. вядома сёння шырокаму колу чытачоў не толькі на Радзіме, але і за яе межамі. Зборнік «З росных сцяжын» склалі аўтабіяграфіі пяцідзесяці чатырох творцаў слова, якія распавядаюць пра мясціны, дзе нарадзіліся, выхоўваліся і вучыліся; пра жыццёвыя і працоўныя дарогі, на якіх сустрэлася багата добрых людзей і сяброў; пра літаратурныя сцежкі ішляхі, якія прывялі іх да зорных вяршыняў.

**Кніга прызначаецца для выкладчыкаў, настаўнікаў, студэнтаў, школьнікаў, а таксама для ўсіх тых, хто цікавіцца беларускай літаратурай.**